PolotskSU



# ЭТНАКУЛЬТУРНЫЯ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ І СУМЕЖНЫХ ТЭРЫТОРЫЙ

УДК: 738:069.5(476.1)

## КЕРАМІЧНЫ ПОСУД, АПЛЕЦЕНЫ БЯРОСТАЙ, СА ЗБОРУ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА МУЗЕЯ НАРОДНАЙ АРХІТЭКТУРЫ І ПОБЫТУ

**Абрамчук А.У.**
Рэспубліка Беларусь, Мінск

*В статье рассматривается традиция оплетания берестой керамической посуды на белорусских землях. Внимание обращено на её историческое развитие, зону распространения, а также на функции и технологию берестяной оплётки. Подробно изучены образцы керамических изделий, обвитых берестой, из фондов Белорусского государственного музея народной архитектуры и быта.*
***Ключевые слова:*** *кераміка, керамічны посуд, ганчарства, ганчарная вытворчасць, бяроста, Паазер'е, Падзвінне, Усходняе Палессе, музейныя калекцыі.*

Сярод разнастайных ганчарных вырабаў, якія захоўваюцца ў калекцыі "Кераміка" Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, а гэта амаль 1900 прадметаў з розных гістарычна-этнаграфічных абласцей Беларусі, сваім каларытным аздабленнем вылучаецца посуд, абгорнуты берасцянымі стужкамі.

Бяросту пачалі ўжываць у якасці матэрыяла для рамонту разбітага альбо трэснутага керамічнага посуду яшчэ ў эпоху неаліта, калі на нашых землях толькі з'явілася ганчарства. Кару з абодвух бакоў накладалі на месцы пашкоджанняў і замацоўвалі шнурком, які прасоўваўся праз загадзя прасвідраваныя адтуліны ў чарапку [1; с. 112]. Пасля гэтага пасудзіну можна было выкарыстоўваць далей, але толькі для захавання сухіх рэчываў.

З цягам часу змянілася як тэхналогія вырабу керамікі, так і спосабы яе рамонту. Пашкоджаны посуд пачалі змацоўваць з дапамогай перапляцення тонкіх берасцяных стужак, што пазбавіла ад неабходнасці ў свідраванні адтулін для шнуркоў. Надзейных дадзеных, аб тым калі на тэрыторыі Беларусі ўзнік такі спосаб рамонту няма. Вядома, што кераміка, абвітая стужкамі бярозы, была выяўлена падчас археалагічных раскопак шэрагу старажытнарускіх гарадоў: Масквы, Ноўгарада, Пскова, Старой Ладагі [2; с. 111], але гаворка, хутчэй за ўсё, ідзе пра верхнія пласты Позняга Сярэднявечча. Так, пры раскопках Масквы гаршчкі, аплеценыя бяростай з мэтай рамонту, былі знойдзены ў слаях XV–XVI ст. [3; с. 15].

У канцы XIX ст. аб аплятанні керамікі бяростай на беларускіх землях з'яўляюцца пісьмовыя крыніцы. Пэўную інфармацыю пра гэту традыцыю на Віцебшчыне паведаміў М.Я. Нікіфароўскі. Паводле яго звестак аплётку рабілі для трываласці на самых розных відах часта толькі набытага і не пашкоджанага посуду: слоіках, гарлачах, гаршчках, "кухліках", гляках [4; с. 84–92], пасля чаго яны атрымоўвалі яшчэ і агульную назву "берасцень" (у арыг. "бирисцень") [4; с. XVI]. Абгортвалі бяростай нават чарапкі разбітых гаршчкоў альбо збаноў, якія потым служылі ў якасці сальніц [4; с. 73]. Увесь гэты посуд, акрамя сталовых місак, у асноўным прызначаўся для захавання і транспарціроўкі прадуктаў, найперш вадкасцяў. Берасцяная аплётка акрамя павышэння трываласці змяншае цеплаправоднасць посуду, што станоўча ўплывае на названыя функцыі.

Па меркаванню Я.М. Сахуты традыцыя аплятання ганчарных вырабаў бяростай ў канцы XIX – першай палове XX ст. існавала ў "кампактным арэале", які ўключаў заходнюю частку Паазер'я і сумежныя землі Літвы [5; с. 194]. Аднак можна з упэўненнасцю сцвярджаць, што кераміка з берасцяной аплёткай была распаўсюджана, няхай і не так масава, на значна большай тэрыторыі. Аб гэтым сведчаць як прадметы з музейнага збору, так і лінгвістычныя дадзеныя. Слова "берасцень" у значэнні керамічнай пасудзіны, абвітай бярозавай карой, ужывалі таксама ў цэнтральных і ўсходніх раёнах Паазер'я [6; с. 80]. Асабліва цікава, што вядома яно не толькі на поўначы, але і на поўдні краіны. Так, у "Дыялектным слоўніку Брэсчыны маецца запіс: "БЕРАСЦЕНЬ м. Гаршчок ці збан, аплецены бяростай. *Узялі берасцень, і пайшлі па ягады.* Юндзілы Пруж." [7; с. 19]. У матэрыялах для дыялектнага слоўніка Гомельшчыны пазначана: "БЕРАСЕНЬ (бераснік) м. гаршчок *(аплецены бяростай).* Масла наліваюць у берасень, і яно тады можа стаяць год і болей (Асінаўка, Чач.); У нас гаршчок аплялі бяростай, і завецца бераснік (Там жа)" [8; с. 190]. Варта адзначыць, што на тэрыторыі сучасных Пастаўскага і Мядзельскага раёнаў берасценем маглі называць любы гарлач, нават без берасцяной аплёткі [9; с. 119–120]. Гэта, хутчэй за ўсё, сведчыць аб даўнасці і асаблівай пашыранасці традыцыі абгортваць керамічны посуд бяростай у дадзенай мясцовасці.

Амерыканскі мастацтвазнаўца Э. Стэллацццыо, які вывучаў літоўскае народнае ганчарства, выказаў думку аб тым, што аплятанне керамікі бяростай было найбольш распаўсюджаным менавіта ў тых рэгіёнах, дзе выраблялася мала якаснага посуду. З-за існуючага дэфіцыту ў такіх месцах яго цанілі і пры пашкоджанні імкнуліся адрамантаваць ці проста зрабіць больш трывалым [10; с. 51]. Гэта цалкам слушна і ў дачыненні да тэрыторыі нашай краіны. У заходніх раёнах Паазер'я было толькі некалькі адносна невялікіх ганчарных асяродкаў гарадскога тыпу з развітай вытворчасцю [11; с. 18-19]. Вясковая ж кераміка, выробленая архаічнай тэхнікай налепу, звычайна не аплятала ся.

Э. Стэллацццыо на аснове расповеду літоўскага рамесніка Вітаўтаса Раманаўскаса апісаў тэхналогію аплятання керамікі берасцянымі стужкамі, прычым, што апошні даведаўся некаторыя сакрэты гэтага працэсу ў калегі з Беларусі. Бяросту нарыхтоўвалі вясной у спрыяльнае надвор'е, калі яна не надта сухая і не надта вільготная, і лёгка аддзяляецца ад дрэва. Кару рассякалі па-спіралі і здымалі з дрэва ў выглядзе асобных стужак, якія потым сушылі. Калі ўзнікала неабходнасць, высушаную бяросту запарвалі ў вадзе разам з рыбінай луской, што часова рабіла яе больш эластычнай, а затым чысцілі і абразалі пад патрэбную пасудзіну. Неабходнага памера стужкі спачатку прымацоўвалі да ганчарнага вырабу натуральным клеем са смалы, пасля чаго пераплялі, звычайна ў выглядзе касой сеткі. Цікава, што ў Літоўскім мастацкім музеі захоўваецца керамічная пасудзіна, абвітая бяростай у тэхніцы, падобнай да прамога пляцення. Пасля высыхання, кара ўсядала і шчыльна сцягвала чарапок. У завяршэнні бяросту насычалі ільняным маслам з пчаліным воскам, каб абараніць яе ад вільгаці [10; с. 51].

PolotskSU



У Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту абсалютная большасць абвітага берасцянымі стужкамі посуду паходзіць з тэрыторыі Паазер’я, пераважна заходняй яго часткі. Гэтыя прадметы былі атрыманы падчас навуковых камандзіровак у канцы 1970-х – першай палове 1980-х гг. Некаторыя з іх маюць характэрныя для дадзенага рэгіёна асаблівасці ў форме: гэта масіўныя, таўстасценныя, слабапрафіляваныя вырабы. Я.М. Сахута звязвае гэтыя адметныя рысы з уплывам на развітыя ганчарныя цэнтры Паазер’я керамікі, выраблен ай у тэхніцы кальцавога налепу [5; с. 193]. Увесь разглядаемы посуд, мае значныя пашкоджанні: буйныя расколіны, сляды склейкі. Гэта сведчыць аб тым, што з дапамогай берасцяной аплёткі яго спрабавалі адрамантаваць.

Адразу чатыры пасудзіны, абвітыя бяростай, перадаў у дар музею жыхар в. Германавічы Шаркаўшчынскага раёна. Гэтыя прадметы датуюцца 20-мі гг. ХХ ст. і маюць пэўную асаблівасць: іх дно і пачатак сценак, а ў адным вырабе толькі ніжняя частка сценак, абгорнуты ільняным саржавым палатном, паверх якога і была зроблена шчыльная суцэльная аплётка берасцянымі стужкамі.

Гаршчок НД 130 (в. – 17.5; д. вусця – 17; д. дна – 13.5) мае пукатае тулава, якое звужаецца да дна, і кароткую прамую шыйку, скошаную ўнутр. Звонку пасудзіна амаль цалкам аплецена бяростай. На пячных гаршчках апётку звычайна рабілі толькі ў выпадку пашкоджання, пасля чаго ў печ іх больш не ставілі [9; с. 116]. Пад слоем бяросты захаваліся рэшткі адбітага вуха, якое не характэрна для дадзенага віда посуду ў паўночнай Беларусі [9; с. 108]. Хутчэй за ўсё, наяўнасць вуха сведчыць аб тым, што пасудзіна першапачаткова, яшчэ да аплёткі, служыла не ў якасці пячнога гаршчка, а выконвала пэўныя функцыі “цёрніцы”, такія як захаванне і пераапрацоўка малочных прадуктаў [9; с. 120]. Вядома, што ў побыце дадзены прадмет выкарыстоўвалі як адстойнік для вырабу смятаны.

Збан НД 131 (в. – 32; д. вусця – 17,8; д. дна – 13.5) уяўляе сабой высокую пасудзіну з ледзь пукатым тулавам, доўгімі плечыкамі, якія паступова звужаюцца да верху, і кароткай расхіленай шыйкай са скругленым венчыкам і носікам для зліву. Насупраць носіка, амаль усутыч да шыйкі, прымацавана шырокае вуха. Усярэдзіне пасудзіна цалкам пакрыта зялёна-жоўтай. а звонку празрыстай палівай, тулава і плечыкі абвіты бяростай. У фондах музея маецца збан аналагічнага тыпу (КП 15532), выраблены ў 1925 г. у г. Дзісна ганчаром па прозвішчы Гартулевіч. Неабходна адзначыць, што сярод нешматлікіх развітых цэнтраў ганчарства Заходняга Паазер’я Дзісна была адным з найбуйнейшых [11; с. 18-19]. Можна меркаваць, што большасць разглядаемага посуду з Шаркаўшчынскага і Міёрскага раёнаў была створана менавіта там.

Гарлач НД 132 (в. – 28,5; д. вусця – 15,8; д. дна – 13) слаба прафіляванай формы, мае ледзь пукатае тулава, злёгку звужаныя да верху плечыкі, якія пераходзяць у кароткую амаль прамую шыйку з трохкутным у разрэзе венчыкам. Пасудзіна ўсярэдзіне пакрыта светла-жоўтай палівай, звонку цалкам абвіта стужкамі бяросты. Прадмет таксама мае аналогіі з дзісненскай керамікай [5; с. 192].

Іншую форму мае гарлач НД 133 (в. – 25,3; д. вусця – 13,3; д. дна – 13). Яго пукатае тулава звужаецца да дна, а доўгія плечыкі канічна звужаюцца да верху і пераходзяць у кароткую шыйку ў форме раструба з ледзь скругленым краем. Прадмет усярэдзіне пакрыты карычнева-зеленаватай палівай, звонку тулава і частка плечыкаў абвіты бяростай, на плечыках выціснуты дзве тонкія прамыя лініі. Гарлачы і збан з в. Германавічы выкарыстоўвалі для захавання малака.

Таксама ў Шаркаўшчынскім раёне быў атрыманы гарлач КП 314 (в. – 21; д. вусця – 11; д. дна – 9), які бытаваў у в. Барсучына. Пасудзіна мае слабапрафіляванае тулава, ледзь звужаныя да верху плечыкі і раструбападобную шыйку без венчыка. Гарлач амаль цалкам абвіты бяростай. Прадмет быў створаны ў 1930-я гг. і меў мясцовую назву “гарнушак”, якая, мяркуючы па ўсім, звязана не з яго формай, а менавіта з функцыянальным прызначэннем: у ім захоўвалі смятану. На Віцебшчыне гарнушкам звычайна называлі маленькі гаршчок з адным ці двума вушкамі, які служыў для захавання смятаны і іншых прадуктаў [4; с. 89].

Некалькі пасудзін, аплеценых берасцянымі стужкамі, былі выяўлены на тэрыторыі суседняга Міёрскага раёна. У в. Мурашкі быў атрыманы смятаннік КП 403 (в. – 13,5; д. вусця – 10; д. дна – 8). Гаспадары набылі яго ў 1930-ых гг. у в. Перабродззе таго ж раёна. Прадмет яйкападобнай формы са слаба выяўленай кароткай шыйкай, прафіляваным носікам для зліву і вухам, якое прымацавана збоку ад носіка. Выраб цалкам пакрыты карычневай палівай з зялёнымі плямамі, а звонку амаль увесь, акрамя верхняй часткі, абвіты бяростай. Паводле С. А. Мілючэнкава такія пасудзіны для захавання смятаны аб’ёмам каля 1 л з вухам і носікам для зліву стваралі на захадзе Віцебшчыны, дзе яны мелі назву “цёрлічкі” [9; с. 122].

Гарлач КП 6513 (в. – 28,5; д. вусця – 18; д. дна – 15) з в. Пестуны Міёрскага раёна згодна ўліковым дакументам быў выраблены ў 1940-я гг. у в. Сухаверджа таго ж раёна. Ніякіх звестак аб гэтым населеным пункце як аб асяродку ганчарства аўтару дадзенага артыкула не сустракалася. Гарлач меў мясцовую назву “стаўбунок”, якая была распаўсюджана ў заходняй і цэнтральнай Віцебшчыны [9; с. 119]. Прадмет уяўляе сабой масіўную сплюснутую пасудзіну з авальным дном і вусцем. Тулава яго пукатае, плечыкі плаўна пераходзяць у невысокую ледзь увагнутую шыйку, якая завяршаецца слаба выяўленым валікам. Усярэдзіне гарлач пакрыты цёмна-зялёнай палівай, звонку абгорнуты бяростай.

Гаршчок НД 1093 (в. – 15; д. вусця – 15; д. дна – 11) бытаваў у в. Дзянісы Міёрскага раёна, а набыты быў на кірмашы ў в. Новы Пагост, якая знаходзіцца непадалёк. Прадмет мае пукатае тулава, якое канічна звужаецца да дна. Акруглыя плечыкі судакранаюцца з ледзь скругленым маленькім венчыкам, скошаным унутр. Усярэдзіне і часткова звонку ўверсе прадмет пакрыты светла-карычневай палівай. На вонкавай паверхні маюцца рэшткі берасцяной аплёткі, якая цалкам не захавалася. Пад венчыкам гаршчок абцягнуты кавалкам меднага дроту. Прадмет выкарыстоўвалі для захавання смятаны.

Сустракаўся ганчарны посуд, аплецены бяростай, таксама ў цэнтральных і ўсходніх раёнах Віцебшчыны. Гарлач КП 2981 (в. – 32; д. вусця – 15,8; д. дна – 14,5) з в. Саснягі Лепельскага раёна, быў набыты ў пач. ХХ ст. у Чашніках, якія з’яўляліся буйным цэнтрам ганчарства [5; с. 192], таму з вялікай доляй верагоднасці, там яго і стварылі. Прадмет уяўляе масіўную таўстасценную пасудзіну з пукатым тулавам і ледзь увагнутай шырокай шыйкай, якая завяршаецца слаба вызначаным няроўным венчыкам. Паверхня гарлача мае глыбокія кальцавыя ўвагнутасці, што, відаць, звязана з пэўнымі асаблівасцямі ў фармоўцы. Усярэдзіне гарлач пакрыты празрыстай палівай. Стужкі бяросты гарызантальна наматаны на шыйку і ў выглядзе касой рэдкай сеткі – на тулава. На плечыках нанесены гарызантальны гладкі паясок ангобу белага колеру. Пасудзіна прызначалася для захавання малочных прадуктаў.

Зусім іншы сілуэт мае Гарлач КП 1459 з в. Латышы Расонскага раёна. Яго мясцовая назва – “жбанок” з’яўляецца распаўсюджанай для гэтага віда посуду на ўсходзе Віцебшчыны [9; с. 119]. Пасудзіна плаўнага S-падобнага профілю з пукатымі бакамі, пакатымі плечыкамі і ледзь увагнутай шыйкай з высокім скошаным вонкі венчыкам. Усярэдзіне цалкам, а

PolotskSU



звонку ў верхняй частцы гарлач пакрыты цёмна-зялёнай палівай, тулава і плечыкі абгорнуты стужкамі бяросты. У фондах музея маецца некалькі вырабаў з Расоншчыны з такімі ж адметнымі венчыкамі, некаторыя з іх пакрыты аналагічнай палівай. У справаздачы аб камандзіроўцы маюцца звесткі аб тым, што "керамічнымі вырабамі забяспечвалі Расонскі раён ганчары вёскі Галынічы Пскоўскай вобласці". Населенага пункта "Галынічы" у Пскоўскай вобласці не існуе, хутчэй за ўсё гэта мясцовая назва в. Галыні Невельскага раёна, якая пазначана ў адным з актаў прыёму на часовае захоўванне. Нажаль, ніякай інфармацыі пра ганчарную вытворчасць у в. Галыні даведацца не атрымалася. Што датычыцца гісторыі разглядаемага прадмета, то згодна дакументацыі ён быў набыты ў прыезджых ганчароў у 1909 г., і служыў для захавання малака і малочных прадуктаў.

Макацёр НД 213 (в. – 26; д. вусця – 24,5; д. дна – 14,5) бытаваў у в. Новая Барсучына Шумілінскага раёна. Прадмет уяўляе сабой масіўную пасудзіну цюльпанападобнай формы з кароткай канічна расхінутай шыйкай, пасярэдзіне якой маецца невялікае патаўшчэнне. Унутраны край шыйкі скошаны. Усярэдзіне макацёр цалкам пакрыта зялёна-жоўтай палівай. На плечыках засталіся рэшткі ад двух вушкаў. Па меркаванню С.А. Мілючэнкава вялікія паліваныя макатры з двума вушкамі былі характэрны для Магілёўшчыны, часткова поўдня Віцебшчыны, і прызначаліся для прыгатавання цеста. Менавіта такую функцыю выконваў і дадзены прадмет. Неабходна заўважыць, што прадмет НД 213 бытаваў паўночней, вызначанай С.А. Мілючэнкавым зоны распаўсюджання, на адносна невялікай адлегласці ад Гарадка, які з'яўляўся ганчарным цэнтрам [5; 26]. У дакументацыі да прадмета не пазначаны час яго стварэння. Хутчэй за ўсё, шырока яго можна датаваць першай паловай ХХ ст.

Адзінай пасудзінай з берасцяной аплёткай, якая паходзіць не з тэрыторыі Паазер'я з'яўляецца керамічная маслабойка КП 12885/аб (в. – 38; д. вусця – 16,5; д. дна – 16) 1920-ых гг. з в. Абрамаўка Рэчыцкага раёна. Яна мае выгляд вялікага чорнаглянцаванага гладыша з круглай драўлянай накрыўкай, пасярэздіне якой праароблена адтуліна для калатоўкі. Цікава, што менавіта ва Ўсходнім Палессі захаваўся да ХХ ст. архаічны спосаб узбівання масла ў ганчарных пасудзінах [12; с. 82]. Гладыш тыповай для керамікі усходняга Палесся формы, мае шарападобнае тулава і доўгую цыліндрычную шыйку, якая ледзь расхіляецца ўверсе і завяршаецца адагнутым валікам. Пасудзіна дэкарыравана па ўсёй паверхні вертыкальнымі глянцаванымі палоскамі. Тулава і плечыкі маслабойкі абгорнуты берасцянымі стужкамі, а шыйка сцягнута ўверсе кавалкам дроту.

Такім чынам, традыцыя аплятання ганчарнага посуду бяростай на нашых землях мае даўнія гістарычныя карані. У канцы ХІХ – першай палове ХХ ст. яна была шырока распаўсюджана на тэрыторыі Заходняга Паазер'я. Вядома, што спрадычна кераміку абвівалі берасцянымі стужкамі і ў іншых частках Віцебшчыны, а таксама ва Усходнім і Заходнім Палессі. Аплётку рабілі альбо на ўжо пашкоджаным посудзе з мэтай рамонта, альбо ў засцерагальных мэтах на цэлым.

Увесь посуд, абвіты бяростай, са збору Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту мае даволі значныя пашкоджанні. Гэта дае падставу меркаваць, што такім спосабам яго рамантавалі. Большасць прадметаў (8 з 12) трапіла ў музей з заходніх раёнаў Віцебскай вобласці: Шаркаўшчынскага і Міёрскага. Па аднаму вырабу бытавала ў Лепельскім, Шумілінскім і Расонскім раёнах, і адна пасудзіна была выяўлена за межамі Паазер'я, у Рэчыцкім раёне Гомельскай вобласці. Бяростай аплецены розныя віды посуду: гарлачы, збан, смятаннік, гаршчкі, маслабойка, макацёр. Гэтыя пасудзіны выкарыстоўвалі пераважна для захавання малочных прадуктаў, альбо для іх пераапрацоўкі (гаршчок, маслабойка), і толькі макацёр прызначаўся для прыгатавання цеста. Дадзеныя прадметы адлюстроўваюць даўнюю рэгіянальную традыцыю, якая мела выключна ўтылітарнае значэнне, але з'яўляецца цікавай для нас яшчэ і з мастацкага пункту гледжання.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Charniauski Max. M., Kryvaltsevich M. M. Belarusian Wetland Settlements in Prehistory [Text] / Max. M. Charniauski, M. M. Kryvaltsevich // Wetland settlements of the Baltic: a prehistoric perspective / ed. by E. Pranckenaite. – Vilnius: Center of underwater archaeology et al., 2011. – Chapter 6 – P. 105-123.
2. Розенфельдт Р. Л. Заметки о древнерусском керамическом производстве [Текст] / Р. Л. Розенфельдт // КСИА АН СССР. – 1962. – Вып. 87. – С. 108–111.
3. Розенфельдт Р. Л. Московское керамическое производство XII-XVII вв. [Текст] / Р. Л. Розенфельдт, (Свод. археологических источников / АН СССР. Ин-т археологии. Археология СССР. Под общ. ред. акад. Б. А. Рыбакова; Вып. Е1-39) – Москва : Наука, 1968. – 124 с., 1 л. ил. : ил.; 29 см. – 1200 экз.
4. Никифоровский, Н. Я. Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии и описание предметов обиходности: (этнографические данные): с географическим видом Витебской губернии и четырьмя чертежами в тексте [Текст] / составил Н. Я. Никифоровский. – Витебск: Губернская типография, 1895. – 552, CLIV с.
5. Сахута, Я. М. Беларускае народнае ганчарства [Тэкст] / Я. М. Сахута. – Минск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2013. – 224 с. – 1800 экз. – ISBN: 978-985-11-0750-2.
6. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны [Тэкст]: у 2 ч. / Л. І. Злобін (рэд. ) [і інш. ]. – Віцебск: УА "ВДУ імя П. М. Машэрава, 2012. – Ч. 1. – 304 с. – 150 экз. – ISBN 987-985-517-644-4.
7. Дыялектны слоўнік Брэстчыны [Тэкст] / [склад. : М. М. Аляхновіч і інш. ; рэд.: Г. М. Малажай, Ф. Д. Клімчук]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 294 с. – 1750 экз. – ISBN 5-343-00293-5.
8. Матэрыялы для дыялектнага слоўніка Гомельшчыны [Тэкст]. – У кн.: Беларуская мова і мовазнаўства. Міжвуз. зборнік. Беларуская мова. — Мінск: Выдавецтва БДУ імя У.І. Леніна. Вып. 3: А-Д. – Мінск, 1975. – 264 с. – 500 экз.
9. Милюченков С. А. Белорусское народное гончарство [Текст] / С. А. Милюченков. – Минск : Наука и техника, 1984. – 183 с. – 1200 экз.
10. Stellacio A. Tosininkyste [Text] / A. Stellacio. // Ceramics Technical issue № 22, Biannual international journal – Australia. 2006. P. 49–52.
11. Hołubowicz W. Garncarstwo wiejskie zachodnich terenów Białorusi [Tekst] / W. Hołubowicz. – Toruń, 1950. – 283 s.
12. Цітоў В.С. Бойка [Тэкст] / В.С. Цітоў // Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя; Рэдкалегія: І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелСЭ, 1989.— 575 с.

PolotskSU



**CERAMIC DISHES BRAIDED WITH BIRCH BARK FROM THE COLLECTION OF THE BELARUSIAN STATE MUSEUM OF FOLK ARCHITECTURE AND RURAL LIFESTYLE**

A. ABRAMCHUK

*The article discusses the tradition of wrapping pottery in birch bark on the Belarusian territory. It draws attention to its historic development and spreading area, as well as to functions and technology of birch bark wrapping. The article studies in detail the examples of ceramic vessels wrapped in birch bark preserved at the Belarusian State Museum of Folk Architecture and Rural Lifestyle.*

***Key words:*** *ceramics, pottery, birch bark, Paazerje, Padzvinne, Ushodniae Palesse, museum collections*.






**Малюнак 1. – Гарлачы**

**Малюнак 2. – Збан НД 131**



**Малюнак 3. – Макацёр НД 213**



**Малюнак 4. – Смятаннік КП 403**



**Малюнак 5. – Маслабойка КП 12885аб**

PolotskSU






**Малюнак 6. – Распаўсюджанне керамічнага посуду**

УДК 351.853.1 (476)

# ПРЫСТАСАВАННЕ МАТЭРЫЯЛЬНЫХ НЕРУХОМЫХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ ПАД САЦЫЯКУЛЬТУРНЫЯ ПАТРЭБЫ (1991–2006 ГГ.) НА ПРЫКЛАДЗЕ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

**Андрэйчык К.В.**
Рэспубліка Беларусь, Навапалацк

*Артыкул прысвечаны дзейнасці мясцовых выканаўча-распарадчых органаў улады па прыстасаванні і выкарыстанні матэрыяльных нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей пад сацыякультурныя патрэбы на прыкладзе тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінак Віцебскай вобласці. Разгледжана прававое поле, у межах якога адбывалася прыстасаванне і выкарыстанне нерухомых каштоўнасцей. Акцэнт зроблены на музеефікацыі культурнай прасторы населеных пунктаў, а таксама практычных захадах па фарміраванні прывабнага турыстычнага іміджу Полацка і Віцебска.*

***Ключавыя словы:*** *дзяржаўная палітыка, выканаўча-распарадчыя органы ўлады, гісторыка-культурныя каштоўнасці, прыстасаванне, Полацк, Віцебская вобласць*

PolotskSU

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ: ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. А.І. Корсак;
канд. гіст. навук В.У. Чараўко;
канд. гіст. навук, дац. У.Я. Аўсейчыка

Наваполацк
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
2021

PolotskSU

УДК 343.13(063)
ББК 67.410.2я431

Рэкамендаваны да выдання саветам гуманітарнага факультэта
Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 3 ад 29.03.2021)

*Рэдакцыйная калегія:*

*А.І. Корсак,* канд. гіст. навук, дац. (адк. рэд.), заг. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*В.У. Чараўко,* канд. гіст. навук, дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*У.Я. Аўсейчык,* канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Рэцэнзенты:*

*С.В. Кулінок,* канд. гіст. навук, заг. аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь;
*Т.А. Джумантаева,* канд. культуралогіі, дац., дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў :** зб. арт. V міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 крас. 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. А.І. Корсак (адк. рэд.), В.У. Чараўко, У.Я. Аўсейчыка. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2021. – 272 с.
ISBN 978-985-531-737-2.

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы па выніках работы V міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў”. Прадстаўлены вынікі антрапалагічных і археалагічных даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб гістарычных лёсах, матэрыяльнай і духоўнай спадчыне рэгіёна Паўночнай Беларусі ў шырокім храналагічным кантэксце (ад першабытных часоў да сучаснасці).

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, археолагаў, этнолагаў, антраполагаў, мастацтвазнаўцаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ, краязнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**УДК 343.13(063)**
**ББК 67.410.2я431**

**ISBN 978-985-531-737-2**

© Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2021

PolotskSU

*Навуковае выданне*

**БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:
ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ
І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ**

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Адказны рэдактар *А. І. Корсак*

Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка
*І. М. Чапкевіч*
Дызайн вокладкі *М. С. Мухаморавай*

Падпісана да друку 20.05.2021. Фармат 60×84 $^{1}/_{8}$. Бумага афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 31,63. Улік.-выд. арк. 32,96. Тыраж 70 экз. Заказ 810.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вырабніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/305 ад 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 ад 08.05.2014.

Вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк.